**Беларуская мова**

**Урок 90**

**Тэма:** Абагульняльны ўрок

**Мэта:** стварыць умовы для актыўнай пазнавальнай дзейнасці вучняў па засваенні тэмы і выкарыстанні атрыманых ведаў у практычнай дзейнасці.

**Задачы:**

- **навучальныя:** плануецца, што ў канцы занятку вучні будуць:

**ведаць** што такое тэкст і яго асношныя прыметы;

**умець** вылучаць структурныя часткі тэксту; падбіраць да яго загаловак; вызначаць тэму і асноўную думку тэксту.

- **развіваючыя:** падчас выканання вучэбных задач садзейнічаць фарміраванню ўмення аналізаваць, рабіць вывады, узбагачаць і развіваць мову вучняў;
- **выхаваўчыя:** садзейнічаць фарміраванню культуры міжасабовага ўзаемадзеяння падчас калектыўнай работы, работы ў парах і групах; стварыць умовы для выхавання беражлівых адносін да прыроды.

**Тып урока:** абагульнення і сістэматызацыі ведаў.

## Ход занятка

### I. Арганізацыйна - матывацыйны этап

**Задача:** *забяспечыць псіхалагічную гатоўнасць класа да ўрока, арганізаваць ўвагу ўсіх вучняў, падрыхтаваць да працы.*

Празвінеў званок і зноў
У клас пазваў маіх сяброў.
Будзем дружна працаваць,
Будзем веды набываць.

- Прачытайце словы, запісаныя на кветачцы. Як адным словам іх можна назваць? Сярод пералічаных слоў, ёсць адно лішняе. Назавіце яго.
- Гэта адмоўная якасць, якая з’яўляецца перашкодай у дасягненніе мэтаў. Якія з прапанаваных слоў нам спатрэбяцца нам на ўроку?
- Жадаю, каб наш урок прайшоў хутка, лёгка, таму што ў спадарожніках у нас працавітасць, стараннасць і іншыя станоўчыя якасці.




Сення на ўроку кожны з вас зможа вырасціць сваю незвычайную кветку. Адзначце на пялестку пад нумарам 1 настрой, з якім вы пачынаеце наш урок.

(Аранжавы колер - настрой выдатны, жоўты- добры настрой, сіній – не вельмі хочацца працаваць. )

## II. Аперацыйна – пазнавальны

Задача: узнавіць веды пра тэкст, яго асаблівасці і асноўныя прыметы, вучыцца прымяняць іх у практычнай дзейнасці.

### 1. Актуалізацыя ведаў. Удакладненне тэмы і мэты ўрока.

*Задача: актывізаваць веды вучняў, забяспечыць пазнавальную матывацыю, камунікатыўную дзейнасць.*

- Перш за ўсе нам з вамі трэба вызначыць, пра што мы будзем сення гаварыць на ўроку. Для гэтага вам прыйдзецца разгадаць крыжаванку, а дапамогуць вам ў гэтым слоўнікавыя словы, якія вам таксама неабходна расшыфраваць.

***Работа ў парах.










**!!!! Адзначце на пялестку пад нумарам 2, як вы справіліся з гэтым заданнем.**

(Аранжавы колер – без памылак, жоўты- не разгадалі адно слова, сіній – узніклі цяжкасці пры выкананні задання. )

- Сення ў нас з вамі апошні ўрок па тэме "Тэкст". На уроку мы абагулім усё, што вывучалі на мінулых уроках. Давайце вызначым задачы нашага ўрока.
- ***На ўроку мы ўспомнім:***
- З чаго…. складаецца тэкст?
- Чым адрозніваецца…. тэкст ад набору сказаў?
- Якія часткі … можна вылучыць у тэксце?
- Што называюць … тэмай тэксту?
- Што называюць … асноўнай думкай тэксту?
- На што можа ўказваць … загаловак тэксту?

**2. Хвілінка прыгожага пісьма.**

-Кожны ўрок мовы мы пачынаем з хвілінкі прыгожага пісьма. І гэты ўрок не стане выключэннем.

Сяду роўна, не сагнуся.

За работу я вазьмуся.

- Прапаную вам акуратна прапісаць у рабочым сшытку вялікую і маленькую літару ТЭ.

- Дайце характарыстыку гуку, які абазначаецца гэтай літарай. (Зычны, парны глухі, няпарны цверды)

Тт (**успомніць, з якіх элементаў складаюцца літары)**

та то ту ты тэ

- Чаму сярод запісаных спалучэнняў няма спалучэнняў з літарамі е, ё, ю, я, і?

**!!!! Адзначце на пялестку пад нумарам 3, як вы справіліся з гэтым заданнем.**

**3. Замацаванне і абагульненне ведаў.**

Прапаную вам разгадаць загадкі і запісаць адгадкі ў свой сшытак (адзін вучань працуе за дошкай).

1. Адна я ў лесе з белаю карой.

Багата сокам веснавой парой. (Бяроза)

2. Я зацвітаю кожным летам

Не пышным – ледзь прыкметным цветам.

Але як толькі зацвіту,

Дык пчолы чуюць за вярсту. (Ліпа)

3. Я засцілаю дол іглiцай.

   Спрадвеку слаўлюся жывiцай. (Сасна)

4. І ў сто гадоў я малады.

   Мае насенне – жалуды. (Дуб)

5. Стаіць у лесе дрэўца,

   Пад ветрыкам лёгка гнецца,

   А гронкі ягадак гараць,

   І снегіры да іх ляцяць…

   Хто здагадаецца, як дрэўца называецца. (Рабіна)

6. Заўседы, летам і зімой,

   Мае іголачкі са мной.

   Галінак у мяне багата.

   Я сустракаю з імі свята (Елка)

   *** Знайсці, падкрэсліць і растлумачыць вядомыя нам арфаграмы, вызначыць колькасць літар і гукаў у слове ЕЛКА.

   -Назвы чаго мы запісалі ў сшытак?

   Ці растуць гэтыя дрэвы ў нашых лясах?

   -Якую карысць прыносяць дрэвы?

**!!!! Адзначце на пялеску пад нумарам 4, як вы справіліся з гэтым заданнем.**

- У вас на стале есць карта. Прачытайце. Ці можна гэта назваць тэкстам? Чаму?

  *На беразе (н, Н)ёмана раскіну…ся дубовы гай такіх дубо… больш нідзе не ўбач…ш за до…гія г…ды яны сталі больш магутныя і непахісныя іх старас..ь абмінула шмат чаго бач…лі на св…ім в…ку ж…цціё многіх пакаленняў прайшло перад імі*
  Вызначце межы сказаў. Устаўце прапушчаныя літары.

  ПРАВЕРКА. ТЛУМАЧЭННЕ ПРАВАПІСУ ПРАПУШЧАНЫХ ЛІТАР.

**!!!! Адзначце на пялеску пад нумарам 5, як вы справіліся з гэтым заданнем.**

Прачытаце яшчэ раз тое, што у нас атрымалася. Ці можам мы гэтыя сказы назваць тэкстам?

- Пра што гэты тэкст? Вызначце яго тэму. (У тэксце гаворыцца пра дубовы гай.)
- Якая асноўная думка гэтага тэксту? Пра што нам хацеў сказаць аўтар? ( пра тое, што дубы- гэта моцныя дрэвы, і іх жыцце шмат даўжэй чалавечага.)

- Дуб – гэта сапраўднае ўпрыгожванне лесу. Велічная прыгажосць і магутная сіла прымушаюць захапляцца гэтым дзіўным дрэвам. Таму кожны з нас павінен клапатліва адносіцца да прыроды, каб мець магчымасць назіраць за яе прыгажосцю.
- Як бы вы назвалі гэты тэкст? На тэму ці галоўную думку будзе указваць гэты загаловак?
- ***Запішыце ў сшытак першы сказ***. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго ці пра што гаворыцца у сказе і што гаворыцца ў сказе.

**УЗАЕМАПРАВЕРКА. УЗАЕМААДЗНАКА**

***Фізкультхвілінка*** *(пад музыку).*

Увага! Зараз ціха устаньце, дзеці *(вучні выходзяць з-за парт),*
Будзем крочыць па планеце *( хадзьба на месцы).*
Раз, два, тры, чатыры,
Крок за крокам па краіне.
Сонца грэе, прыпякае (*левая і правая рукі ўгору),*
Лёгкі ветрык павявае *(махі рукамі),*
Жыта спелае качае *(нахілы ўлева, управа).*
Вось дайшлі мы да крыніцы —
Выпіце з яе вадзіцы *(нахіл уперад).*
У небе птушак карагод, (*левая і правая рукі ўгору),*
І мы адправімся ў палёт. *(махі рукамі),*
Улева, управа павярніся *(павароты ўлева і ўправа)*
І сябрам сваім усміхніся ( *вучні ўсміхаюцца адзін аднаму)*

**РАБОТА У ГРУПАХ** (вучні падзяляюцца на групы па шэсць чалавек. Кожная група атрымлівае набор сказаў. Адна група працуе на мульцібордзе.)

*** Прачытайце сказы на палосках. Размясціце іх ў правільным парадку, каб атрымаўся тэкст.

Яна ціхенька адышла ад гн…зда.
Яна с…дзела на г…лінцы недалёка ад гн…зда.
На др…ве яна …бач…ла гн…здо з птушанятамі.
Сінічка пр…ля…ела к…рміць птушанят.
Аднойчы Волечка пайшла ў лес.

Дзя…чынка не захацела палохаць птушку.

ПРАВЕРКА ВЫКАНАННЯ.

**!!!! Адзначце на пялестку пад нумарам 6, як ваша група справілася з гэтым заданнем.**

- Пра каго гаворыцца ў гэтым тэксце? (Пра дзяўчынку і птушку)
- Якая галоўная думка тэкста? (Дзяўчынка не захацела палохаць птушку)
- Прыдумайце загаловак да гэтага тэксту.
- Колькі частак мы можам вылучыць у гэтым тэксце? Знайдзіце пачатак, асноўную частку, канцоўку.
- А як бы вы паступілі на месцы дзяўчынкі? Як вы паводзіце сябе, калі бываеце ў лесе. Якія правілы паводзін у прыродзе вы ведаеце? Давайце паўторым іх.

1. Нельга ламаць дрэвы і кусты.
2. Нельга раскладваць вогнішчы ў недазволеных месцах.
3. Нельга знішчаць жаб, змей і іншых жывёл.
4. Нельга рваць кветкію
5.Нельга разбураць гнезды, мурашнікі.
6. Нельга парушаць лясную цішыню.
7. Трэба прыбіраць за сабой смецце.

**Гульня “Складзі прыказку”**

***Дзеці атрымліваюць разрэзаную на словы прыказку. Па сігналу павінны яе скласці і запісаць ў сшытак.

1 рад: Многа лесу – не губі, мала лесу – зберажы, няма лесу – пасадзі.

2 рад: Згубіць дрэва – пяць хвілін, вырасціць – сто гадоў.

3 рад: Разбураючы мурашнік, ты разбураеш дом сваіх сяброў.

**!!!! У нашай кветачкі засталася нерасфарбываная сярэдзінка, вызначце, як ваша група справілася з гэтым заданнем.**

**ІІІ. Падвядзенне вынікаў урока.**

*Задача: вызначыць узровень сфарміраванасці ведаў і ўменняў па тэме.*

Работа з кластарам.

- Давайце падагульнім нашы веды пра тэкст.




**IV. Рэфлексія. “Рамонкі”**

- Мы закончылі вывучэнне тэмы “Тэкст”. Кожны з вас сення стараўся працаваць. Прапаную вам размясціць свае тварыкі на адпаведных рамонках.